Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 КРАСАВІКА 2014 г. СЕРАДА № 65 (27675) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Адаптацыя з абмежаванымі магчымасцямі

СТАР.2

Адкуль у Мсціславе “Парыж”?

СТАР.6

У Магілёве казкі ажылі

СТАР.8

БЯСПЕКА І ГАСЦІННАСЦЬ — ПАНЯЦЦІ СУМЯШЧАЛЬНЫЯ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка патрабуе забяспечыць бяспеку на ЧС па хакеі, не дастаўляючы нязручнасцяў гасцям

Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў на пасяджэнні Савета бяспекі. У першую чаргу Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на пытаннях правядзення чэмпіянату свету па хакеі і забеспячэнні бяспекі падчас яго правядзення, паведамляе БЕЛТА. «Наша першачарговая задача як арганізатараў заключаецца ў тым, каб забяспечыць бяспеку ўдзельнікаў і гасцей. Галоўнае — не дапусціць ніякіх правакацый. Пры гэтым мы павінны паспрабаваць зрабіць так, каб гэтыя меры бяспекі былі ненавязлівыя, не кідаліся ў вочы, не ціснулі на ўдзельнікаў і гасцей спаборніцтваў, на журналістаў», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў значнасць для Беларусі гэтага спартыўнага форуму. «Гэта грандыёзная па маштабах і важнасці падзея. Сапраўды спартыўнае свята як для беларускага народа, так і для мільёнаў аматараў хакея ўсёй сусветнай супольнасці», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Я ўпэўнены, што мы зможам прадэманстраваць высокую ступень арганізацыі сусветнага хакейнага форуму, а таксама даказаць усім, што мы сапраўды цывілізаваная дзяржава ў цэнтры Еўропы, каб кожны, хто прыедзе да нас, ад'язджаючы, захаваў у памяці ветлівасць і добразычлівасць беларускага народа», — адзначыў Прэзідэнт.

Дарэчы, як паведаміў на пасяджэнні прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч, удзел у чэмпіянаце свету па хакеі ў Мінску пацвердзілі ўсе 16 краін. «Алімпійскі, сапраўды спартыўны, прынцып перамог кан'юнктурныя і неканструктыўныя заклікі», — заўважыў Міхаіл Мясніковіч.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што турніры такога маштабу заўсёды маюць палітычны падтэкст. «Нельга забываць, што вакол гэтага чэмпіянату нямала спекуляцый. Пачынаючы ад заклікаў нашых апазіцыянераў, так званай «пятай калоны», байкатаваць спаборніцтвы і да спроб шантажу з боку замежных нядобразычліўцаў», — нагадаў Прэзідэнт. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў: «На шчасце, у заходніх экспертных палітычных колах, няхай і запознена, але нарастае разуменне вычарпанасці цяперашняга інструментару ціску на Беларусь. Гучаць заклікі да выпрацоўкі новых поглядаў і падыходаў».

Паводле слоў Прэзідэнта, асабліва каштоўнай для Беларусі з'яўляецца падтрымка міжнародных спартыўных арганізацый. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што, нягледзячы на жорсткі прэсінг з боку асобных еўрапейскіх арганізацый і палітыкаў, Міжнародная федэрацыя хакея і асабіста Рэнэ Фазель не завагаліся пад націскам, былі бескампрамісныя і верныя спартыўным ідэалам.

Беларусь фактычна гатовая да правядзення чэмпіянату, прагучала на пасяджэнні. «Спартыўныя аб'екты «Мінск-Арэна» і «Чыжоўка-Арэна», паводле ацэнак экспертаў, з'яўляюцца аднымі з найлепшых у Еўропе. Яны гатовы да правядзення матчаў», — заявіў Міхаіл Мясніковіч. У першым матчы, які пройдзе 9 мая на «Мінск-Арэне», будуць змагацца зборныя каманды Беларусі і ЗША. Білеты на гэтую гульню прададзены цалкам. Паводле слоў прэм'ер-міністра, білетнай праграме была нададзена асаблівая ўвага. Коштавая палітыка сфарміравана такім чынам, што матчы змогуць наведаць людзі з розным узроўнем даходаў. Так, на матчы папярэдняга этапу цэны складаюць ад 6 да 50 еўра, на матч фінальнай стадыі — ад 25 да 400 еўра.

Па стане на 7 красавіка прададзены і забраніраваны 354 тысячы білетаў на «Мінск- Арэну» (75% ад агульнай колькасці) і 142 тысячы білетаў на «Чыжоўка-Арэну» (67%). Замежным гасцям рэалізавана 70,5 тысячы білетаў. Асноўная доля продажаў для замежных гасцей прыпадае на Расію і Латвію. Таксама досыць вялікую цікавасць праявілі балельшчыкі з Фінляндыі, Швейцарыі, Германіі, Славакіі.

СТАР.2

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

11 красавіка 2014 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца чарговае пасяджэнне чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

ДОБРЫЯ ВЕСТКІ З БЯРОЗАЎКІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Калінкавіцкім раёне шануюць і захоўваюць унікальны мясцовы абрад

Штогод на Дабравешчанне Бярозаўка нібы ажывае. Старэйшыя людзі выходзяць з двароў, каб справіць свята — праспяваць, прайсціся па сяле, пагукаць вясну. Вось і сёлета спяваць вяснянкі і вадзіць карагоды сюды завітала гэтая вядомая ад Мазыра да Хойнікаў спявачка і гарманістка, кіраўнік Бярозаўскага Дома культуры Паліна Лапацік з дзіцячым фальклорным гуртом «Пацехі».

СТАР.3

ЛІЧБА ДНЯ

150%

бюджэту пражыткова-га мінімуму можа скласці грашовае ўтрыманне для тых, хто будзе праходзіць альтэрнатыўную службу ў Беларусі. Такая норма змяшчаецца ў законапраекце «Аб альтэрнатыўнай службе», паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Палаце прадстаўнікоў. Таксама прадугледжана ўвесці для «альтэрнатыўных службоўцаў» абавязковае дзяржаўнае страхаванне за кошт бюджэту па аналогіі з салдатамі-тэрміновікамі. Плануецца, што альтэрнатыўную службу грамадзяне будуць праходзіць перш за ўсё ў арганізацыях, якія адносяцца да сацыяльнай сферы, у прыватнасці, у бальніцах, дамах-інтэрнатах, тэрытарыяльных цэнтрах сацабслугоўвання. Законапраект прадугледжвае, што грамадзянін можа хадайнічаць аб праходжанні альтэрнатыўнай службы па рэлігійных перакананнях. Пры гэтым хадайніцтва павінна быць абгрунтавана.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.04.2014 г.

Долар ЗША	9910,00	■
Еўра	13630,00	▲
Рас. руб.	279,00	▼
Укр. грыўня	847,01	■

НЕ САПСУЙЦЕ САБЕ ВЯСНУ!

Навесці парадак на ўчастку і не пазбавіцца маёмасці з-за ўласнай нядбайнасці ўдаецца не ўсім

Пачынаецца дачны сезон. На лецішчы едуць дзясяткі тысяч людзей, якія пачалі прыводзіць прысядзібныя ўчасткі ў належны стан пасля працяглай адсутнасці. Зразумела, што непатрэбнае смецце, якое назбіралася за гэты час, ім прыйдзецца кудысьці дзяваць. Самы лёгкі варыянт — гэта адправіць яго ў полымя. Але ж ён, гэты варыянт, самы небяспечны.

Несвядомыя дачнікі пачынаюць проста спальваць сухую траву і іншае смецце, забыўшыся пры гэтым на правілы супрацьпажарнай бяспекі. І такая неахайнасць можа выйсці бокам не толькі для гаспадара, але і для яго суседзяў па пасёлку, таварыстве або вёсцы. Асабліва гэта важна цяперашнім скупым на дажджы пачаткам вясны...

— Толькі за першыя тры месяцы спальванне смецця скончылася самым непапраўным для пяці чалавек! Як правіла, ахвярамі агню становяцца пажылыя людзі, якія з-за стану здароўя не могуць аператыўна пакінуць ачаг полымя, — гаворыць **начальнік аддзела арганізацыі прафілактычнай работы МНС Руслан ЛІХАМАНАЎ.** — Яшчэ адна адметнасць безадказных паводзін з агнём у прыватным сектары — бескантрольнае распаўсюджванне полымя. Свежы выпадак адбыўся 30 сакавіка ў вёсцы Новая Ніва Крупскага раёна. У 15.20 у цэнтр аператыўнага рэагавання раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях паступіла паведамленне аб загаранні смецця. Падраздзяленне на месца падзей прыбыла аператыўна, але з-за сухога надвор'я агонь пайшоў гуляць па вёсцы. Усяго ж адкрытым полымем гарэлі 4 нежылыя дамы і 8 гаспадарчых пабудоў. Сярод іншага, падобныя рукатворныя катастрофы адбыліся не так даўно ў Рагачоўскім ды Магілёўскім раёнах... Так, у апошнім выпадку няшчасце прыйшло ў вёску Паддуб'е Семукацкага сельскага Савета 29 сакавіка. Адкрыта гарэлі 4 нежылыя дамы і 7 гаспадарчых пабудоў. Цяпер па факце пажару праводзяцца адпаведныя следчыя дзеянні. Пра канчатковую прычыну ўзнікнення пажару казаць пакуль ранавата. Але ў якасці адной з версій разглядаецца несанкцыянаванае падпальванне травы.

СТАР.3

■ Спецыяльны рэпартаж

ГЕНЕРАЛЬНАЯ ПРЫБОРКА

Карэспандэнт «Звязды» змяніла ручку на мятлу і пайшла наводзіць чысціню

Напярэдадні першага красавіцкага суботніка на пад'ездах з'явіліся аб'явы, якія заклікалі жыльцоў узяць удзел у добраўпарадкаванні мікрараёна пасля зімы. «Хочаш жыць у чысціні — пачні з сябе», — падумала я і вырашыла адгукнуцца на запрашэнне ЖЭСа.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ідзіце... лесам

У суботу раніцай выпраўляюся ў ЖЭС. Каля ганка ў клумбе корпаецца нейкая жанчына. «Ну што ж, ужо буду не адна», — падумалася з палёгкай. Уваходжу ў будынак і трапляю ў атмасферу сапраўднага суботніка: дзве паспартыўнаму апранутыя дзяўчыны мітусяцца ў пошуках рыштунку для прыборкі і фарбавання. Кажу, што хацела б далучыцца да суботніка. «А вы хто? Жыліца? — чую ў адказ. — Пачакайце, зараз вам дадуць інвентар. А дзе б вы хацелі папрацаваць?» Адказваю, што гэта не мае значэння. «Ну, тады можаце далучыцца да астатніх жыльцоў, яны выказалі жаданне прыбрацца ў лесе каля бегавой дарожкі». У якасці пацвярджэння мне паказваюць адпаведную заяву ад жыльцоў, падпісаную чатырма прозвішчамі...

СТАР.3

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЕЎРАСАЮЗ ПАСТАВІЎ ПЕРАД СГА «СВІНСКАЕ» ПЫТАННЕ

Улады Еўрасаюза афіцыйна абскардзілі ў Сусветнай гандлёвай арганізацыі ўведзеную Рассельгаснаглядам забарону на ўвоз у Расію еўрапейскай свініны і вырабленых з яе прадуктаў. Падставай для ўвядзення забароны стала нядаўняе выяўленне ў Літве ачагоў афрыканскай чумы свіней (АЧС).

«... Забарона Расіяй еўрапейскай свініны відавочна не сувымерная пагрозе і супярэчыць правілам СГА», — растлумачыў еўракамісар па гандлі Карэл дэ Гюхт. У сваю чаргу, камісар ЕС у галіне аховы здароўя Тоніа Борг адзначыў, што расійскія санітарныя ведамствы адмаўляюцца замяніць поўную забарону на ўвоз еўрапейскай свініны абмежаваннямі на пастаўку мяса з заражаных раёнаў. Для ЕС такія расійскія захады даволі адчувальныя: у 2013 годзе краіны Еўрасаюза экспартавалі ў Расію свініны агульным коштам каля 1,4 млрд еўра, што склала прыкладна 25% ад агульнага аб'ёму экспарту свініны за межы ЕС. Тым часам Рассельгаснагляд спыніў чарговую партыю мяса і сала з Украіны агульнай вагой больш за 200 тон.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

РАДА ЗРАБІЛА БОЛЬШ ЖОРСТКАЙ АДКАЗНАСЦЬ ЗА СЕПАРАТЫЗМ

Будынак Службы бяспекі Украіны ў Данецку і Харкаўская абласная дзяржаўная адміністрацыя па стане на 8 красавіка вызвалены ад прарасійскіх актывістаў. Пра гэта заявіў в.а. прэзідэнта Украіны, спікер Аляксандр Турчынаў. Акрамя таго, Турчынаў адзначыў, што ў час вызвалення Харкаўскай адміністрацыі супраць работнікаў праваахоўных органаў былі выкарыстаны «як зброя, так і ручныя гранаты, некалькі супрацоўнікаў праваахоўных органаў атрымалі цяжкія раненні». Міністр унутраных спраў Арсен Авакаў паведаміў, што 64 з 70 прарасійскіх актывістаў, затрыманых падчас антытэрарыстычнай аперацыі ў Харкаве, прадставіліся грамадзянамі Украіны.

Пасля сутыкненняў, якія адбыліся каля будынка абласной адміністрацыі ў Мікалаеве (абласным цэнтры на поўдні Украіны) у ноч на 8 красавіка, міліцыя затрымала 23 чалавекі. Па даных гарадскога ўпраўлення міліцыі, затрыманы ўдзельнікі сутыкненняў з абодвух бакоў. Паводле інфармацыі абласнога ўпраўлення аховы здароўя, у сутычках пацярпелі 15 чалавек, 11 з іх шпіталізаваны.

Тым часам Вярхоўная Рада прыняла папраўкі ў Крымінальны кодэкс Украіны, якія робяць больш жорсткай адказнасць за падрыў нацыянальнай бяспекі краіны. У прыватнасці, былі дапоўнены артыкулы Асаблівай часткі кодэкса 110 (замах на тэрытарыяльную цэласнасць і недатыкальнасць Украіны), 111 (дзяржаўная здрада), 113 (дыверсія), 114 (шпіянаж) і артыкул 279 (блакіраванне транспартных камунікацый, а таксама захоп транспартнага прадпрыемства). Дэпутаты павялічылі тэрміны турэмнага зняволення для рэцыдывістаў, якія здзейснілі гэтыя злачынствы, і ўвялі вышэйшую меру пакарання (пажыццёвае зняволенне) у выпадках, калі названыя вышэй дзеянні прывядуць да гібелі людзей або да іншых цяжкіх наступстваў.

КОРАТКА

Аб'яўлены конкурс «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь». Заяўкі на ўдзел падаюцца да 1 верасня 2014 года ў сакратарыяты абласных конкурсных камісій, сфарміраваныя ў абласных цэнтрах стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі і РУП «Беларускі дзяржаўны інстытут метралогіі».

Бясплатная ўстаноўка відэакамер у пад'ездах Мінска пачалася ў рамках праграмы «Бяспечны дом». Рэалізацыя праграмы праходзіць у тры этапы. Першы этап уключае ў сябе бясплатную замену састарэлых дамафонных сістэм. На другім этапе жыльцам прадастаўляецца магчымасць індывідуальнай устаноўкі відэадамафонаў у кватэрах і дадатковых камер на лесвічнай клетцы. На трэцім этапе праводзіцца бясплатная ўстаноўка відэакамер у пад'ездах.

Трымальнікі банкаўскіх плацежных картак Visa, MasterCard і БЕЛКАРТ любога банка атрымалі магчымасць ажыццяўляць аперацыі з бескантактнымі праязнымі білетамі Мінскага метрапалітэна ў інфакіёсках ААТ «БПБ-Ашчадны банк».

■ Адукацыйны рынак: правілы гульні

ІНВЕСТЫЦЫІ Ў БУДУЧЫНЮ,

або Чаму над якасцю адукацыі трэба працаваць пастаянна

«Якасць адукацыі разам з коштам адукацыйных паслуг з'яўляюцца сёння галоўнай канкурэнтнай перавагай беларускіх ВНУ», — заявіў на адкрыцці міжнароднага адукацыйнага форуму «Еўрапейская якасць адукацыі» міністр адукацыі Сяргей МАСКЕВІЧ.

— Як нам бачыцца, асноўны прагрэс у сферы яе далейшага павышэння можа даць развіццё універсітэцкіх сістэм менеджменту якасці, якія дазволяць граматна кіраваць вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. Менавіта ў гэтым кірунку мы і развіваемся, — падкрэсліў міністр. — Для распрацоўкі ўнутрывузаўскіх сістэм менеджменту якасці ў кожнай ВНУ створаны адпаведныя арганізацыйныя структуры — Саветы па якасці, у якія ўваходзяць і студэнты як спажыўцы адукацыйных паслуг. Яны ўдзельнічаюць у абмеркаванні арганізацыі вучэбнай дзейнасці, навуковай работы, у распрацоўцы і рэалізацыі дакументаў, якія рэгламентуюць усе аспекты жыцця студэнцкай моладзі. Атрыманне зваротнай сувязі ад студэнтаў у форме адказаў на пытанні анкеты стала шырока распаўсюджанай з'явай, і гэтая зваротная сувязь улічваецца пры распрацоўцы вучэбных праграм.

Па словах міністра, у павышэнні якасці адукацыі асноўную ролю адыгрывае выкладчыцкі састаў. Інтэлектуальны патэнцыял выкладчыкаў непазбежна суадносіцца з іх актыўнай навуковай дзейнасцю, паколькі па-за ёю выкладчык асуджаны на чытанне «чужых» падручнікаў і іх больш ці менш умелую трансляцыю студэнтам. Толькі той, хто пастаянна самаўдасканальваецца ў сваёй дзейнасці, зможа перадаць навучэнцам веды.

На форуме падкрэслівалася, што тэма якасці прафесійнай адукацыі надзвычай актуальная сёння для ўсіх еўрапейскіх краін. І той факт, што менавіта Беларусь была абрана стартавай пляцоўкай для правядзення першага міжнароднага адукацыйнага форуму, прысвечанага праблемам якасці адукацыі, многія ў нашай краіне палічылі добрым знакам. Мерапрыемства праходзіць пры падтрымцы Міністэрства адукацыі, Пасольства Беларусі ў Злучаным Каралеўстве Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі, Пасольства Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі ў Беларусі, а яго арганізатарамі выступілі брытанская бізнес-школа «Magna Carta Oxford» і Цэнтр міжнародных сувязяў Міністэрства адукацыі.

Як адзначыў **дырэктар Цэнтра міжнародных сувязяў Аляксандр САМУЙЛІЧ,** глабалізацыя свету зрабіла адукацыю інтэрнацыянальнай: «Мы знаходзімся на рэальным рынку, дзе павінны канкурыраваць з іншымі ігракамі. А таму для нас так важна вывучаць самыя розныя тэндэнцыі і навуковыя падыходы да арганізацыі вучэбнага працэсу і павышэння якасці падрыхтоўкі».

СТАР.2